■ Ёсць пытанне

# ПРЭПАРАТ АДЗІН, А ЦАНЫ — ДЗВЕ?

«Мой бацька — інвалід 1 групы. Кожны месяц мы купляем для яго даволі дарагое лякарства (алзепіл). Каб хоць неяк сэканоміць, адсочваем па інтэрнэце кошт прэпарата ў аптэках Мінска і набываем там, дзе ён таннейшы. Аднак на гэты раз у аптэцы, куды я прыехала, мне сказалі, што прэпарат ёсць. 691 000 і 715 000 рублёў (у старых цэнах). А прадаць мне могуць толькі за 715 000, спасылаючыся на нейкую пастанову Міністэрства аховы здароўя. Адкажыце, калі ласка, што гэта за дакумент і чаму хворы чалавек не мае права набыць тое, што ён хоча?

**В. Кулінковіч**, *г. Мінск*».



Патлумачыла **начальнік упраўлення фармацэўтычнай інспекцыі і арганізацыі лекавага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Людміла РЭУЦКАЯ**.

1 ліпеня набыў моц Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №288 («Аб унясенні змяненняў...»), згодна з якім новы парадак фарміравання коштаў на лекі паспрыяў зніжэнню кошту на большасць з іх у аптэчнай сетцы. Разам з тым, сёння ў нас ёсць факты няправільнага прымянення фармацэўтычнымі работнікамі аптэк нормы Належнай аптэчнай практыкі — «пры наяўнасці ў аптэках адной і той жа гандлёвай назвы лекавага сродку яго рэалізацыя ажыццяўляецца ў парадку паступлення з улікам астаткавага тэрміну прыдатнасці». Устаноўлены выпадкі, калі на партале tabletka.by і іншых аптэкі размяшчаюць звесткі аб адначасовай рэалізацыі аднаго і таго ж сродку па розных коштах. На практыцы пры зваротах грамадзян у такія аптэкі (як у дадзеным выпадку) фармацэўтычны работнік адмаўляўся рэалізоўваць лекі па больш нізкім кошце, спасылаючыся на пункт 63 Належнай аптэчнай практыкі.

**Аднак, згодна з гэтым жа заканадаўствам, адначасовая рэалізацыя адной і той жа гандлёвай назвы лекавага сродку па дзвюх ці некалькіх розных цэнах у адной аптэцы не дапускаецца. Недапушчальнай таксама з'яўляецца сітуацыя, пры якой спачатку даецца інфармацыя аб наяўнасці канкрэтных гандлёвых назваў адначасова па розных коштах, а пасля грамадзянам адмаўляюць у рэалізацыі па больш нізкім.**

Для прадухілення новых падобных выпадкаў няправільнага разумення нормаў заканадаўства кіраўнікам юрыдычных асоб і спецыялістам, адказным за фармацэўтычную дзейнасць, даручана не дапускаць наяўнасці ў аптэцы адной і той жа назвы прэпарата адначасова па розных коштах. У выпадку паступлення новай партыі прэпарата, рознічны кошт на які ніжэй за той, што ёсць у рэалізацыі, варта прыняць меры, скіраваныя на зніжэнне, напрыклад, гандлёвай надбаўкі на тую партыю, што паступіла раней.

■ Рабі, як мы

# Прыкусіце языкі: не ўжывайце мацюкі!

**...Некалі Сакрат казаў: «Загавары са мной, каб я цябе ўбачыў».**

Культуру мовы і сапраўды нельга аддзяліць ад агульнай культуры чалавека.

У нашым раёне дзейнічае акцыя «Скажам брыдкаслоўю НЕ!» Ініцыятарам яе тры гады таму стаў прыход Свята-Узнясенскай царквы. Тады протаіерэй Мікалай і я, яго памочнік, сталі выступаць з лекцыямі на гэтую тэму. З часам да нас падалі далучацца прадстаўнікі БРСМ, міліцыі, камісіі па справах непаўналетніх, раённай бальніцы... Сярод слухачоў былі вучні старэйшых класаў... Але ж аднойчы, пасля такой вось сустрэчы, да мяне падышоў юнак і сказаў, што справа, якую мы робім, безумоўна, патрэбная, але не толькі моладзі. «Добра было б, каб такія лекцыі, такія размовы, — прапанаваў ён, — вы праводзілі яшчэ і з... бацькамі». Прычым хлопец гаварыў пра гэта з такім болем, што няцяжка было зразумець, як жа «дастала» яго атмасфера брыдкаслоўя ў сям'і!

З таго дня мы вырашылі пашырыць практыку падобных гутарак яшчэ і на працоўныя калектывы. Прапанову гэтую падтрымалі ў раённым выканаўчым камітэце. На адной з нарад у прысутнасці кіраўнікоў раённых прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў нам далі магчымасць патлумачыць, якую разбуральную сілу нясе брыдкаслоўе, як уплывае на псіхічнае і фізічнае здароўе людзей.

І працяг чакаць сябе не прымусіў: у хуткім часе шчырыя размовы з дарослымі адбыліся ў раённым спажывецкім таварыстве з загадчыкамі крамаў, кавярняў і сталовых, у раённым аддзеле па надзвычайных сітуацыях... Ёсць запрашэнні ад лясгаса і камунальнікаў.

Але ж брыдкаслоўе — з'ява вельмі распаўсюджаная, і не толькі ў нас. А таму і змагацца з ёй трэба разам, на ўсіх франтах. Магчыма, нашу ініцыятыву, наш досвед падтрымаюць іншыя?

**Валерый ГАЎРЫШ**,

*г. Чавусы*

■ Наша марка

# «ХАРОШКІ» — ЯНЫ І Ў ПУСТЫНІ «ХАРОШКІ»!

**...Традыцыя: у войска нас праводзілі ўсёй акругай, клуб набіўся бітком. І было там, здаецца, усё: і шчырыя пажаданні, і вясёлыя конкурсы з армейскага быту, і адмысловы канцэрт, і дзівосныя, дарагія падарункі. Кожны з нас, прызыўнікоў, атрымаў тады па невялічкім шаўковым мяшэчку са жменькай роднай зямлі. Апроч таго, нашы дзяўчаты па прапанове класнай кіраўніцы Вольгі Іванаўны вышылі ўсім прыгожыя сурвэткі з сардэчным надпісам: «Помні аднакласніц. Вясна, 1988 год».**

Акурат тады, вясной 1988-га, і пачалася мая армейская служба.

Праходзіла яна ў далёкім Туркестане. Там на першым ранішнім аглядзе, які праводзіў старшына роты, я з хваляваннем дастаў асабістыя рэчы, сярод якіх былі тая вышытая сурвэтка і жменька роднай зямлі. За тое, што трымаю іх, нашу пры сабе, чакаў вымовы, а выйшла ўсё наадварот. Старшы прапаршчык Ягнёнкаў — высокі, статны, з алтайскіх казакоў — моцна паціснуў мне руку, сказаў: «Насі гэта годна!..»

Такім чынам падарункі маіх аднакласніц два гады грэлі маё салдацкае сэрца.

У памяці да скону і яшчэ адна знакавая падзея, якая дадала мне гонару за маю Беларусь, маіх землякоў.

...Свабодных месцаў у Доме афіцэраў тады не было. Ад моцнай спёкі (пад +50!) не ратавалі нават тоўстыя мураваныя сцены.

А на сцэне тым часам пачыналася дзейства: да нас завіталі «Харошкі» — сюды, лічы, у самае сэрца пустыні Каракум!

Напярэдадні хлопцы-саслужыўцы розных нацыянальнасцяў з цікавасцю распытвалі нас, беларусаў, хто ж такія гэтыя «Харошкі»? А што мы маглі адказаць, калі і самі бачылі іх хіба па тэлевізары. Таму і выкручваліся як хто мог: тлумачылі, што гэта танцавальны ансамбль, што выступае ён у фальклорным жанры, што само слова «Харошкі» азначае, што гэта гурт вельмі харошых, вясёлых людзей...

Тое, што яны, гэтыя харошыя і вясёлыя людзі, рабілі на сцэне ў паўнюткай і, што там казаць, вельмі душнай зале Дома афіцэраў, захапляла ўсіх з першых акордаў, з першых танцавальных крокаў і трымала ўжо да самага канца выступлення! Гарэзлівая полька, жартаўлівы кракавяк, «Лявоніха» — усё гэта было такім родным і блізкім!.. Прычым, як згледзеў, не толькі для мяне — для ўсіх маіх таварышаў. Хлопцы не маглі стрымаць сваіх пачуццяў: кожны нумар прымаўся на «ўра!», гэта значыць, на «біс»! «Вось гэта беларусы. Вось гэта харошкі!» — узбекі, казахі, туркмены ўзрушана пляскалі нас (?!) па плячах, моцна ціснулі рукі, атрымліваючы сапраўдную асалоду ад выступлення нашых землякоў. Цудоўная харэаграфія, прыгожыя касцюмы, самабытная нацыянальная музыка, гумар і найвялікшы ўзровень майстэрства!

Гучнымі апладысментамі, ад якіх, здаецца, магла абрынуцца столь, мы яшчэ доўга трымалі артыстаў на сцэне. І яна тады падалася мне сапраўдным астраўком, аазісам роднай беларускай зямлі сярод спякотнай далёкай пустыні.

...Праляцелі гады, але ж кожны раз, калі выступаюць «Харошкі», я з душэўнай цеплынёй успамінаю той канцэрт у туркменскім горадзе Чарджоу, які пакарыў сэрцы маіх армейскіх таварышаў амаль з усіх рэспублік былога Савецкага Саюза. А таму праз любімую «Звязду» хачу шчыра павіншаваць мастацкага кіраўніка «Харошак» Валянціну Іванаўну Гаявую з яе прыгожым юбілеем і сказаць, што ваша праца сапраўды нясе людзям радасць!

**Генадзь МІШЧУК**,

*в. Вотчына, Маларыцкі раён*

■ Рэзананс

# «І НАЙПЕРШАЕ ІМЯ ТУТ ЯНКА!»

## Ці ўсё ж Францыск?

**У нумары «Звязды» ад 28 ліпеня прачытаў, што ў хуткім часе наш аэрапорт перастане быць безыменным, што ён, як і многія іншыя аэрапорты ў іншых краінах, атрымае імя.**

Згодны: Францыск Скарына — вельмі вядомы чалавек і паважаны, прычым — ва ўсім свеце. Я вельмі ганаруся, што ён беларус. Але ж у нас, калі не блытаю, ёсць ордэн і медаль імя Скарыны, ёсць Нацыянальная бібліятэка, помнікі, вуліцы (напэўна ж, не толькі ў сталіцы?), ёсць Таварыства беларускай мовы, розныя прэміі і г.д.

Як шчыры аматар айчыннай літаратуры і паэзіі, я даўно пісаў, што нашаму Нацыянальнаму аэрапорту добра было б надаць імя вялікага Янкі Купалы. Ён — песняр, якіх мала, і шчыры беларус — гэтага, безумоўна ж, заслугоўвае! Ды і назва як загучыць: «Аэрапорт імя Янкі Купалы»... Што адпавядае нашаму часу, больш сугучна нашаму жыццю, што аддае даніну павагі савецкаму перыяду агульнай гісторыі, перыяду, у якім жыў, тварыў і загінуў вялікі песняр, жылі нашы дзяды і бацькі, і ў якім, нягледзячы на сур'ёзныя памылкі, вырасла цэлая плеяда слынных паэтаў і пісьменнікаў, якіх трэба чытаць, якімі трэба ганарыцца. І найпершае імя тут — Янка...

А зрэшты, добра было б, каб па такіх пытаннях маглі выказацца людзі. І каб да іх меркаванняў нехта прыслухаўся.

**Уладзімір ГОЛУБЕЎ**,

**чытач газеты з 1957 года**,

*г. Мінск.*

*P.S. Карыстаючыся выпадкам, хачу павіншаваць «Звязду», яе супрацоўнікаў і ўсіх чытачоў з прыгожай датай — з 99-годдзем, якое святкуецца 9 жніўня, шчыра пажадаць ёй святціць далей, святціць сама мала столькі ж!*

*Што для гэтага трэба? Я думаю так: берагчы сваіх старэйшых чытачоў (бо ў іх сіла) і паважаць новых, маладых, бо ў іх далейшы лёс — і газеты, і мовы*

■ Весткі з месцаў

# Адпачынак, які ўражвае

**Летнія канікулы яшчэ ў разгары, і нашы вучні праводзяць іх, зразумела ж, па-рознаму. Адны адпачываюць, а некаторыя вырашылі актыўна папрацаваць.**

Летні лагер працы і адпачынку «Факел» — гэта месца і час вольных зносін ў сябрамі і педагогамі, якія разам з дзецьмі ўдзельнічаюць у розных праектах, не патрабуючы ад іх невыканальнага і не ставяць адзнак. «Разам працуем — разам адпачываем» — вось так сцісла можна ахарактарызаваць дзейнасць лагера. Асноўны накірунак яго праграмы — краязнаўства. Вучні разам з педагогамі рэалізавалі праект «Навагрудак — мая малая Радзіма», і дапамагала ў гэтым цеснае супрацоўніцтва з работнікамі краязнаўчага музея. Разам з імі мы зноў і зноў ішлі па знаёмых сцежках шляхам пазнання гісторыі роднай зямлі.

А яшчэ ў нашым горадзе шмат месцаў, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Адно з іх — Музей яўрэйскага супраціўлення, які знаходзіцца на тэрыторыі былога ваяводскага суда, дзе ў 1942 — 1943 г.г. было яўрэйскае гета. Пасля наведвання экспазіцыі ўзнікае шмат пытанняў, і на кожнае з іх мы паспрабуем знайсці адказ.




**Ніна ШАФАР**,

**настаўніца рускай мовы і літаратуры**,

*г. Навагрудак*